Калегія: надзённае ў галіне

# Мэтавы погляд на перспектыву

## Каб першае месца працы стала пастаянным



**Не зважаючы на тое, што да нас набліжаюцца навагоднія святы, планавая калегія Міністэрства культуры, якая адбылася 17 снежня пад старшынствам міністра культуры Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Матвейчука, прайшла ў напружаным, канструктыўным рэжыме і разгледзела шэраг важных і актуальных пытанняў галіны.**

Гэтым разам члены калегіі, начальнікі і супрацоўнікі ўпраўленняў культуры абласцей сабраліся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў — адной з галіновых ВНУ, дзе рыхтуюцца кадры для ўстаноў культуры нашай краіны. І гэты ход быў не выпадковы: адным з асноўных пытанняў, што разглядалася пад час калегіі, стала работа БДУКіМ па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў. Перад пасяджэннем усіх удзельнікаў калегіі чакала экскурсія па універсітэце, знаёмства з тым вучэбнымі і творчымі магчымасцямі, якія мае сёння яго студэнты.

З грунтоўным дакладам па пытаннях размеркавання маладых спецыялістаў — выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў выступіў намеснік міністра культуры Віктар Кураш. Адзначаючы агульныя станоўчыя тэндэнцыі ў пытанні размеркавання маладых спецыялістаў, ён, аднак, звярнуў увагу прысутных на шэраг момантаў, якім нельга не надаваць належнай увагі ці ігнараваць увогуле. У прыватнасці, адным з пытанняў, што патрабуе пэўнай карэкціроўкі, стала наступнае: па выніках размеркавання 2008 года больш чым 50% выпускнікоў БДУКіМ атрымалі накіраванні на сваё першае месца працы ў Мінск і Мінскую вобласць. А між тым, універсітэт — установа рэспубліканскага падпарадкавання, якая мусіць клапаціцца пра кадравае забеспячэнне ўсёй галіны, а не толькі рэгіёнаў, блізкіх да сталіцы. Тым больш, што забеспячэнне маладымі спецыялістамі ўстаноў культуры аграгарадкоў — адна з прыярытэтных на сённяшні дзень задач для ВНУ галіны.

Як жа дасягнуць таго, каб рэгіёны не “галадалі” ад недахопу ініцыятыўных кадраў на месцах? Каб тыя маладыя спецыялісты, якія трапляюць у аграгарадкі і вёскі па размеркаванні, замацоўваліся на месцах, а не падлічвалі дні да сканчэння тэрміну працы? Да вырашэння гэтых пытанняў варта падыходзіць сістэмна, улічваючы і першапачатковыя, зыходныя абставіны, і тую перспектыву, што вымалёўваецца перад студэнтамі універсітэта ўжо сёння. Як паказвае статыстыка, у параўнанні з гараджанамі, працэнт студэнтаў універсітэта — выхадцаў з сельскай мясцовасці значна ніжэйшы. Гэта, натуральна, спрыяе таму, што многія з іх без асаблівай ахвоты едуць на працу па размеркаванні ў рэгіёны. Якім чынам можна зменшыць гэтае напружанне? Адзін з варыянтаў — больш пільная праца з абітурыентамі, якія накіроўваюцца на вучобу ў БДУКіМ па мэтавым наборы. На жаль, гэтае пытанне на сённяшні дзень яшчэ не ва ўсіх рэгіёнах знаходзіцца на належным кантролі: напрыклад, па Магілёўскай вобласці за апошнія пяць гадоў на вучобу ва універсітэт паступіў усяго адзін мэтавік.

Але ператварэнне Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтва ў буйную “карпарацыю” па падрыхтоўцы кадраў дае падставы для роздумаў адносна мэтазгоднасці канцэнтрацыі адукацыйнага працэсу ў адным месцы — у сталіцы. Сёння пры належнай арганізацыі працы філіялы ў рэгіёнах могуць прынесці вельмі шмат станоўчых вынікаў. У якасці прыкладу можна згадаць Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі, якая сёння мае свае філіялы і рыхтуе спецыялістаў практычна ва ўсіх абласных гарадах. Іншая справа, што праца філіялаў павінна быць не проста прадумана і прапрацавана метадычна, але і падмацавана прафесарска-выкладчыцкімі кадрамі высокага ўзроўню. Бо прыклад дзейнасці Мазырскага філіяла БДУКіМ, дзе асноўную частку выкладчыкаў складаюць работнікі мясцовага музычнага вучылішча, прадэманстраваў, як можна дэвальваваць добрую і слушную ідэю.

Дарэчы, пра неабходнасць аптымізацыі падрыхтоўкі спецыялістаў гаварыў у сваім выступленні і рэктар БДУКіМ Барыс Святлоў, адзначаючы: часам складваецца ўражанне, што некаторыя спецыялізацыі ва універсітэце ўзнікаюць не ў залежнасці ад надзённых патрэб галіны, а... з прычыны неабходнасці забеспячэння гадзінамі асобных выкладчыкаў. Сучасная ж сітуацыя вымагае падрыхтоўкі, у першую чаргу, спецыялістаў-універсалаў, якія маглі б хутка і якасна адаптавацца да канкрэтных умоў сваёй будучай працы. З гэтай прычыны рацыянальнай бачыцца ліквідацыя шэрагу вузкапрофільных спецыяльнасцей на карысць большай увагі да падрыхоўкі такіх запатрабаваных прафесіяналаў, як рэжысёры, харэографы, бібліятэкары... Выпускнік БДУКіМ мусіць мець комплексныя веды, а ўжо ў залежнасці ад далейшага свайго прафесійнага шляху ён зможа ўдасканальваць запатрабаваны іх спектр на базе Інстытута павышэння кваліфікацыі, у які быў сёлета рэарганізаваны Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры.

На жаль, пры пільным вывучэнні праблем размеркавання маладых спецыялістаў у рэгіёны аказалася: далёка не ва ўсіх выпадках “тармажэнне” ствараюць выпускнікі. Здараецца, сваю незацікаўленасць у накіраванні заявак і прыёме на працу маладых спецыялістаў праяўляюць мясцовыя кіраўнікі аддзелаў культуры. Як вынік — немалы працэнт сярод выпускнікоў універсітэта складаюць тыя, хто падае заяўкі на пераразмеркаванне. А між тым, акурат гэты момант — шчырая зацікаўленасць кіраўнікоў у працы маладых спецыялістаў — адыгрывае не апошнюю ролю ў іх замацаванні на месцы размеркавання. Надзвычай пазітыўны прыклад на гэты конт прывёў у сваім кароткім выступленні начальнік аддзела культуры Валожынскага раёна Вікенцій Адамовіч. Ён, у прыватнасці, расказаў, што для замацавання выпускнікоў на месцы іх першай працы аддзел культуры набыў чатырохпакаёвую кватэру, пераабсталяваўшы яе пад інтэрнат для маладых спецыялістаў, у мясцовым жыллёва-будаўнічым кааператыве выдзелена 10 кватэр для работнікаў культуры раёна, у аграгарадках таксама прадугледжваецца жыллё для размеркаваных, якія прыбылі на працу ва ўстановы культуры.

Сярод іншых пытанняў, узнятых на калегіі, абмяркоўваліся мерапрыемствы па музеефікацыі замкавага комплексу “Мір” і палацава-паркавага ансамбля Радзівілаў у Нясвіжы. Члены калегіі заслухалі паведамленні дырэктараў двух музеяў, якія падрабязна распавялі не толькі пра этапы працы над гэтымі аб’ектамі, што знаходзяцца пад пільнай увагай Прэзідэнта нашай краіны і Міністэрства. Абмяркоўваліся і пытанні фарміравання музейных экспазіцый у Міры і Нясвіжы, закупкі аўтэнтычных экспанатаў, а таксама і такія шляхі іх папаўнення, як, у прыватнасці, дапамога фондаў іншых музеяў нашай краіны. Значная ўвага надавалася і таму, у якой форме гэтыя музейныя ўстановы і помнікі архітэктуры — Мірскі замак і Нясвіжскі палац — змогуць па заканчэнні пэўнага этапа работ наладзіць сваю працу па турыстычным абслугоўванні насельніцтва.

Акрамя таго, прысутныя азнаёміліся з вынікамі работы ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама па выкананні Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў і малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў на 2007 — 2010 гады, абмеркавалі шэраг іншых, не менш важных, пытанняў.

**Наш кар.**





**На здымках: пад час пасяджэння калегіі.**
**Фота Юрыя ІВАНОВА**

**Цэнтральны камітэт Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, Гомельскі абкам і Гомельскі райкам прафсаюза работнікаў культуры ў сувязі з трагічнай гібеллю выкладчыкаў Новагуцкай дзіцячай школы мастацтваў Гомельскага раёна выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім ЛЯВОНЦЕВАЙ Лідзіі Аляксееўны, МАКСІМАВАЙ Святланы Мікалаеўны, ЦЯРЭШЧАНКА Аксаны Міхайлаўны, СЦЕПАНЦОВАЙ Ірыны Сяргееўны, ЗАРЫЧАНАВАЙ Дар'і Сяргееўны.**

**Старшыня ЦК М.М. ШАЎЦОЎ**
**Старшыня Гомельскага абкама прафсаюза В.А. АЛЕЙНІК**
**Старшыня Гомельскага райкама прафсаюза Л.А. АРЭХАВА**

**Пастаўскі раённы выканаўчы камітэт і аддзел культуры глыбока смуткуюць з прычыны заўчаснай смерці заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь, члена журы Міжнароднага фестывалю народнай музыкі “Звіняць цымбалы і гармонік”, кіраўніка фальклорнага народнага ансамбля “Крупіцкія музыкі” Уладзіміра Мікалаевіча ГРОМА і выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыка.**

**Калектыў Палаца культуры г. Маладзечна, Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля песні і танца “Спадчына” глыбока смуткуюць з прычыны смерці Уладзіміра Мікалаевіча ГРОМА, заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь, дацэнта кафедры духавой музыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, жыццё якога можна абазначыць словамі: “Жыць — гэта значыць творча працаваць...”. Заўчасна абарвалася яго жыццё. Застаецца памяць у сэрцах тых людзей, хто яго ведаў.**